УДК 374.713.83-053.6:37.035.[6]:398

**Л.Л. Ражкова**

# Фарміраванне этнічнай самасвядомасці асобы: метадалогія даследавання

У 90-х гадах XX стагоддзя новы віток свайго асэнсавання ў педагогіцы атрымала праблема фарміравання этнічнай самасвядомасці асобы. Асноўны напрамак даследаванняў магчыма акрэсліць як прыстасаванне распрацаваных дэфініцый да канкрэтнага навучальна-выхаваўчага працэсу. Актыўны ўдзел у вырашэнні гэтай праблемы бяруць і беларускія навукоўцы-педагогі: Л.А. Альшэўская (1993), Н.У. Альшэўская (2002), А.А. Грымаць (1994–1996), А.А. Міхневіч (1996), Л.М. Варанецкая (1997), Л.Г. Зайцава (2000). У работах

гэтых аўтараў [1–3] разглядаюцца розныя пытанні фарміравання этнічнай (нацыянальнай) самасвядомасці асобы ў навучальна-выхаваўчым працэсе ўстаноў адукацыі рознага ўзроўню. Такія, як фактары, метады, сродкі фарміравання, працэс інтэрыярызацыі этнічных каштоўнасцей. Гэтыя пытанні вырашаюцца як на тэарэтычным узроўні, так і на практычным. Аднак, нягледзячы на шматлікія спробы мэтанакіраванага фарміравання гэтага віду самасвядомасці асобы ў навучальным працэсе агульнаадукацыйных устаноў, застаюцца яшчэ пытанні, якія патрабуюць свайго асвятлення. Адно з такіх пытанняў – метадалагічная аснова фарміравання этнічнай самасвядомасці асобы.

Варта пазначыць, што літаратура па самасвядомасці і этнічнасці як у айчыннай, так і замежнай навуцы вельмі багатая і разнастайная. Выдатная даследчыца этнічнасці, доктар псіхалагічных навук Вера Юр'еўна Хацінец у развіцці тэорыі этнічнай самасвядомасці вылучае чатыры кірункі: эвалюцыя канцэпцыі самасвядомасці ў шырокай гістарычнай перспектыве, азначэнне яго сацыяльнай дэтэрмінацыі, вывучэнне самасвядомасці ў структуры Я-канцэпцыі замежных тэорый асобы XX стагоддзя, культурна-этнічны кірунак, які звязаны з распрацоўкай тэорыі самасвядомасці і праяўленнем цікавасці навукоўцаў да этнакультурнай супольнасці – «народу» [4]. Будзем і мы прытрымлівацца ў асвятленні гэтага пытання прапанаванага ўмоўнага падзелу.

Першы кірунак уяўляе сабою эвалюцыю канцэпцыі самасвядомасці ў шырокай гістарычнай перспектыве [5; 6]. Закладзенае старажытнагрэчаскімі філосафамі разуменне самасвядомасці як рэфлексіўнага ўзроўню свядомасці, у еўрапейскай культуры і сёння працягвае сваё існаванне. Самасвядомасць разглядаецца як іманентная, ідучая з глыбіні духу ўнутраная актыўнасць суб'екта, як рэфлексія суб'екта, які спазнае самога сябе, ацэнка чалавекам сваіх ведаў і маральнага аблічча, ідэалаў і матываў паводзін, цэласная ацэнка самога сябе як дзеяча, які мысліць і адчувае, а таксама і ўсведамленне ўласных псіхічных уласцівасцей і якасцей, запатрабаванняў, здольнасцей, схільнасцей, матываў паводзін, перажыванняў і думак. Слова «сама» характарызуе зварот свядомасці на сябе ўласна, акцэнтуе каштоўнасныя адносіны да сябе; аналіз, ацэнку, вывады аб сабе як аб'екце вывучэння.

Другая лінія развіцця канцэпцыі самасвядомасці звязана з азначэннем яго сацыяльнай дэтэрмінацыі. Сацыялагічны аспект самасвядомасці індывіда звязаны з усведамленнем асобай сябе як выканаўцы пэўных сацыяльных роляў у сацыяльным узаемадзеянні людзей, якія аб'яднаны ў розныя сацыяльныя супольнасці з мэтай ажыццяўлення карыснай дзейнасці [7; 8]. Кожны індывід усведамляе сябе ў якасці прадстаўніка таго або іншага грамадства, той або іншай сацыяльнай групы, культуры. Асабліва трэба пазначыць вынікі адной з школ псіхалагічнай антрапалогіі, якая існавала ў рамках гэтага кірунку ў Амерыцы 30–40 гадоў XX стагоддзя пад назвай «Культура і асоба» (Р. Бенедыкт, К. Дзюбуа, М. Мід і інш.). Вывучэнне працэсаў сацыялізацыі, інкультурацыі, універсальных і культурна-спецыфічных сродкаў, спосабаў, метадаў уваходжання і засваення індывідам культуры свайго народа пашырылі разуменне сацыяльнага складаемага самасвядомасці.

Трэці кірунак у вывучэнні самасвядомасці разгортваецца ў рамках замежных тэорый асобы XX стагоддзя, а менавіта вывучэнне самасвядомасці ў структуры Я-канцэпцыі. Агульнае вызначэнне Я-канцэпцыі раскрывае яе як дынамічную сістэму кагнітыўных уяўленняў аб уласным «Я», рэпрэзентатыўных у дачыненні да таго, кім чалавек з'яўляецца. Яна прадстаўляе сабой выніковы прадукт усіх працэсаў самасвядомасці, з дапамогай якіх фарміруецца «вобраз Я». Вывучэнне самасвядомасці ў замежнай тэорыі асобы ўключае тры асноўныя падыходы, якія адрозніваюцца паміж сабою «аксіяматычнымі ўяўленнямі адносна чалавечай прыроды», якія маюць

дачыненне да свабоды і дэтэрмінацыі псіхічнай самарэгуляцыі ў кагнітыўным, афектыўным і канатыўным аспектах [9]. Асноўныя філасофскія палажэнні, закладзеныя ў аснову тэорый асобы, адрозніваюцца пазіцыямі адносна ступені праяўлення ўнутранай свабоды «Я». Гэтыя палажэнні могуць займаць крайнія пазіцыі: сапраўднай свабоды «Я», адказнага за ўласныя дзеянні – тэорыі А. Адлера, А. Маслоу, К. Роджэрса і дэтэрмінісцкі арыентаваныя тэорыі асобы З. Фрэйда, Э. Эрыксана, Б. Скінера, дзе праяўлення «Я» абумоўліваюцца як унутранымі фактарамі: прыроджанымі – генетычным і біялагічным субстратам індывіда, так і набытымі – навучэннем, неўсвядомленымі матывамі, раннім дзіцячым досведам, і знешнімі – умовамі сацыялізацыі і іншымі сацыякультурнымі ўплывамі. Сярэднюю пазіцыю, якая сцвярджае з аднаго боку актыўнасць, волю, асабістую адказнасць, свабоду выбару і самавызначэння «Я», а з другога – дэтэрмініруючыя фактары ў адзінстве або ва ўзаемнай дэтэрмінацыі займаюць тэорыі асобы Э. Фрома, Г. Олпарта.

У айчыннай псіхалогіі вывучэнне самасвядомасці вызначаецца шэрагам прынцыпаў і метадалагічных падыходаў, якія выяўляюць прыроду і сутнасць дадзенага феномену [6; 10]. Асаблівае значэнне набылі прынцыпы: 1) адзінства свядомасці і дзейнасці (С.Л. Рубінштэйн, А.М. Лявонцьеў, Б.Г. Ананьеў, Б.М. Цяплоў, А.А. Смірноў), які «адкрывае магчымасць ісці да пазнання ўнутранага зместу асобы, яе перажыванняў, свядомасці, зыходзячы ад знешніх дадзеных яе паводзін, спраў і ўчынкаў» [11]. Гэты прынцып сцвярджае апасродкаванасць функцыянавання самасвядомасці, яе сацыяльную абумоўленасць, паколькі яна ўзнікае і фарміруецца ў дзейнасці чалавека ў яго зносінах з другімі людзьмі; 2) прынцып развіцця самасвядомасці (Л.С. Выгоцкі, С.Л. Рубінштэйн, І.М. Сечанаў, Б.Г. Ананьеў, В.С. Мерлін) раскрываецца ў прызнанні бесперапыннасці змены самасвядомасці на працягу ўсяго жыцця чалавека. «Кожная стадыя ў развіцці самасвядомасці мае спецыфічны ўзровень і ўласцівую для дадзенага ўзроўню своеасаблівасць магчымасцей пазнаць сябе, здольнасці да самаацэнкі і самарэгуляцыі дзейнасці і паводзін» [6, с. 41]; 3) прынцып гістарызму (Л.С. Выгоцкі, А.Г. Спіркін) сцвярджае, што філагенетычна самасвядомасць абумоўлена працэсам гістарычнага развіцця чалавека ў грамадстве. Самасвядомасць актуалізуецца на пазнейшых стадыях развіцця індывіда ў параўнанні са свядомасцю – узнікае на аснове свядомасці і мовы. Найбольш важнай высновай, сфармуляванай пры вывучэнні працэсу гістарычнага развіцця самасвядомасці, стала заключэнне аб тым, што «гэты шлях не вычэрпваецца толькі перамяшчэннем зместу свядомасці і раскрыццём свядомага аналізу іншых сфер жыцця – сфер сацыяльнага вопыту і адносін да сябе як да ўдзельніка грамадскага жыцця. Гаворка ідзе аб значна большых фундаментальных зрухах – аб фарміраванні новых псіхалагічных сістэм, здольных адлюстроўваць не толькі знешнюю рэчаіснасць, але і свет сацыяльных адносін і ў канчатковым рахунку свой уласны ўнутраны свет, сфарміраваны ў дачыненні да другіх людзей» [12]; 4) прынцып асабістага падыходу (С.Л. Рубінштэйн, К.К. Платонаў, В.С. Мерлін і інш.), сцвярджае, што шматлікія акты самасвядомасці выступаюць як арганічна ўключаныя ў асобу і складаюць адну з утваральных яе ўмоў. Працэс развіцця самасвядомасці ўключаны ў генезіс самой асобы, «самасвядомасць не мае самастойнага шляху развіцця, асобнага ад развіцця асобы...» [11, т. 2, с. 238]; 5) прынцып сістэмнага падыходу да даследавання самасвядомасці дазваляе разглядаць яго як цэласную шматкампанентную сістэму (В.С. Мерлін).

Чацвёрты – культурна-этнічны – кірунак распрацоўкі тэорыі самасвядомасці, звязаны з праяўленнем цікавасці навукоўцаў да этнакультурнай супольнасці – «народа». Яшчэ ў XVIII стагоддзі італьянскі даследчык

Дж. Віко сцвярджаў, што толькі «новая навука» праз гістарычны аналіз мовы, міфаў, рытуалаў розных народаў дапаможа спасцігнуць праўдзівую чалавечую прыроду. У канцы XIX стагоддзя І. Гердэр, развіваючы гэтую ідэю, паказвае, што народныя традыцыі ствараюць тое арганічнае адзінства, якое надае чалавечым супольнасцям уласцівае ім адчуванне ідэнтычнасці. Вынікам развіцця гэтых ідэй у сучаснай замежнай сацыяльнай навуцы з'явілася разуменне этнічнасці ў трох асноўных кірунках: прымордыялізм, сітуацыянізм, канструктывізм, якія аказалі ў той або іншай ступені ўплыў на айчынную тэорыю этнасу, фарміраванне яе канцэптуальнага апарату.

У цэнтры прымордыялізма (В. Берг, Э. Сміт, К. Гірц і іншыя) знаходзіцца духоўная аснова этнічнасці. «У кожным грамадстве амаль ва ўсе часіны некаторая прыхільнасць вынікае з пачуцця натуральнай, духоўнай блізкасці хутчэй, чым з сацыяльнага ўзаемадзеяння» – гаворыць К. Гірц [4, с. 45]. Так, Э. Дюркгейм вылучае здольнасць абраду выклікаць у яго ўдзельнікаў аднолькавы псіхічны стан, які спараджаецца не мэтамі і прычынамі групавога збору, а самім фактам аб'яднання [13]. Таму такія этнакультурныя формы, як абрады, ініцыіруюць глыбокія пачуцці і ў сілу сваёй архаічнасці і традыцыйнасці садзейнічаюць усведамленню супольнасці людзей як адзінага цэлага. Прыхільнікі дадзенага падыходу дэкларуюць, што пачуццё, звязанае з этнічнай прыналежнасцю, надзвычай устойлівае, стабільнае і таму дамінантнае ў параўнанні з другімі эмацыянальнымі перажываннямі. У якасці падстаў этнічнай ідэнтычнасці яны разглядаюць культурныя маркеры, такія, як мова, звычаі, рэлігія і іншыя.

З пункту погляду сітуацыянізму этнічнасць вызначаецца і выяўляецца ў залежнасці ад сітуацый. Так, этнічная самасвядомасць можа выяўляцца толькі пры вызначаных умовах, «выклікаецца да жыцця і выкарыстоўваецца ў мэтах сацыяльнай мабілізацыі, пераадольвання дамінавання і падначалення, сацыяльнага кантролю, ажыццяўлення ўзаемных паслуг і салідарных паводзін, імкнення да гармоніі і для дасягнення геданістычных памкненняў» [14]. Падкрэсліванне сітуацыйнай дэтэрмінацыі этнічнасці дазваляе даследчыкам ставіць пытанні аб умовах, якія актывізуюць або элімінуюць этнічныя з'явы розных фактараў, што ў рознай ступені ўдзельнічаюць у стварэнні этнічнасці. У рамках гэтага падыходу яна разглядаецца як з'ява гнуткая, якая змяняе свой змест у залежнасці ад перамен сацыяльнага асяроддзя.

З пазіцый канструктывізму этнічнасць ёсць артэфакт, кім альбо чым штучна сканструяваны або ўяўлены. Для паслядоўнікаў гэтага кірунку этнічнасць караніцца не ў «сэрцах», а ў «галовах» этнічных суб'ектаў, «уяўных супольнасцей» або «сацыяльных канструкцый» [15]. Людзі самі канструіруюць сваю ідэнтычнасць у залежнасці ад той або іншай культурнай мадэлі у працэсе пастаяннай вытворчасці і ўзнаўлення (канструявання) этнічных значэнняў і сэнсаў элементаў культурных сістэм. Этнічнасць у рамках канструктывізму ёсць align рознавідавое ўтварэнне з рознымі формамі выразу і праяўлення ў залежнасці ад сацыякультурных канструкцый.

У Амерыцы і Заходняй Еўропе работы па праблемах нацыянальнай (этнічнай) самасвядомасці з'яўляюцца ў 50–70-я гады XX стагоддзя, дзе гэты тэрмін разглядаецца пераважна як «нацыянальна ўсведамляючыя сябе плямёны» (P. Grieger, M. Moerman, O. Klineberg, M. Zavalloni, L.S. Sengor, H. Tagfel, J. Harding, B. Kutner). З выхадам прац па тэорыі ідэнтычнасці Э. Эрыксана [16] у канцэптуальны апарат замежных этнолагаў уваходзіць тэрмін, які азначае атаясамліванне чалавекам самога сябе з другімі членамі сваёй супольнасці, тым самым набліжаючы гэты тэрмін да паняцця самасвядомасці. Шырока выкарыстоўваецца ў працах замежных даследчыкаў і тэрмін *ethnic identity*, што сведчыць аб іх павышанай цікавасці да этнічных з'яў і працэсаў у сацыяльнай супольнасці. Аднак у цэлым замежныя аўтары не спрабуюць размежаваць дадзеныя паняцці, атаясамліваючы іх адзін з адным.

Сярод замежных прац па нацыянальнай (этнічнай) праблематыцы заслугоўвае ўвагу параўнальнае даследаванне У. Ламберта і О. Клайнберга ў адзінаццаці краінах свету. Мэта даследавання была акрэслена як высвятленне ўяўленняў дзяцей аб сваім уласным народзе і іншых народах. Абагульняючай працай сярод замежных работ з'яўляецца праца Ховарда Д. Эрліха па сацыяльнай псіхалогіі прымхаў, дзе ён здолеў падрабязна разгледзець і класіфікаваць шматлікія даследаванні этнічных уяўленняў дзяцей. На падставе гэтага разглядаюцца пытанні першапачатковага з'яўлення этнічнай самасвядомасці, механізм узнікнення этнічных прымхаў і іх уплыў на этнічную самасвядомасць асобы, устаноўкі-адносіны да іншых этнічных груповак.

У савецкіх і постсавецкіх этнолагаў няма адзінага, агульнага падыходу да этнічнасці [17]. Унутры гэтай традыцыі можна вылучыць толькі дзве апазіцыйныя канцэпцыі этнасу – гэта канцэпцыі Ю.В. Брамлея і Л.М. Гумілёва. На думку Б.Я. Вінера [18] існуе пэўнае падабенства паміж прымардыялісцкім падыходам у заходняй канцэпцыі этнасу і тэорыяй этнасу савецкага перыяду. Іх аб'ядноўваюць уяўленні аб этнічных супольнасцях як надзвычай устойлівых сацыяльных групах, якія могуць існаваць на працягу шматлікіх стагоддзяў, аб этнічнай самасвядомасці як устойлівым сацыяльна-псіхалагічным феномене і аб нейкім глыбокім і ўстойлівым прымардыяльным пачуцці, звязаным з этнічнай прыналежнасцю. У той жа час прысутнічае і кірунак на сітуацыйны погляд, пры якім, нягледзячы на прымардыяльнае ядро ідэнтычнасці, прызнаецца значэнне гістарычных, эканамічных і палітычных фактараў у фарміраванні этнічнай ідэнтычнасці.

Навука савецкага і постсавецкага перыяду мае больш распрацаваную канцэпцыю этнічнай (нацыянальнай) самасвядомасці ў параўнанні з заходняй этналогіяй. У ёй склалася пэўная сістэма поглядаў на самасвядомасць, але фарміраванне асобных яе складаемых працягваецца дагэтуль [19]. У канцэпцыі разглядаюцца асноўныя праблемы: фарміраванне паняцця «этнічная (нацыянальная) самасвядомасць»; гістарычная рэтраспекцыя яго вывучэння; метадычныя асновы яго даследавання; азначэнне месца нацыянальнай самасвядомасці сярод другіх прымет нацыі; этнічная (нацыянальная) самасвядомасць і этнічныя супольнасці рознага таксанамічнага ўзроўню; нацыянальная самасвядомасць і тыпы этнічнай супольнасці; этнагенез і нацыянальная самасвядомасць; кампаненты нацыянальнай самасвядомасці і іх вытокі; суадносіны нацыянальнай самасвядомасці і другіх форм грамадскай самасвядомасці; асаблівасці этнічнай самасвядомасці ў розных сацыяльна-эканамічных фармацыях і гістарычных эпохах; функцыяніраванне асобных бакоў нацыянальнай самасвядомасці ва ўзаемасувязі з сацыяльна-эканамічным развіццём грамадства; суадносіны паміж этнічнай самасвядомасцю народа і яго саманазвай; прычыны ўзмацнення або паслаблення ролі этнічнай самасвядомасці ў гісторыі этнасу. Яе асноўныя палажэнні раскрываюцца на старонках манаграфій аўтараў С.Т. Калтахчяна, А.Г. Агаева, С.А. Атамурадава, М.С. Джунусава, К.Н. Хабібуліна, Ю.У. Брамлея, А.Ф. Дашдамірава. У цэнтры навуковых даследаванняў пачатку 70-х гадоў XX стагоддзя знаходзіліся такія кампаненты нацыянальнай (этнічнай) самасвядомасці, як этнічныя стэрэатыпы і ўстаноўкі, каштоўнасныя арыентацыі, нацыянальныя інтарэсы, стаўленне да сваёй культуры, міжнацыянальныя адносіны (Ю.В. Арацюнян, Л.М. Драбіжава, Я.І. Кляменьцьеў, А.А. Кажанаў, Г.У. Кцоева, У.У. Піменаў). З'яўляецца шэраг работ [20], прысвечаных праблемам узаемасувязі традыцыйнай культуры этнасаў з нацыянальнай самасвядомасцю (В.Я. Гусеў, І.В. Казакова, М. Крукоўскі, К.В. Чыстоў і іншыя).

Вынікі праведзеных этнаграфічных даследаванняў паказалі, што кожны сацыяльны індывід валодае пэўнай сукупнасцю меркаванняў аб тым, што са-

бой уяўляе яго ўласная этнічная супольнасць, якое месца яна займае сярод такіх жа ўтварэнняў на міжнароднай арэне, што ўваходзіць у паняцце «этнічныя асаблівасці асобы» і шэрагу падобных паняццяў. Нацыянальная самасвядомасць паўстае перад намі як адна з форм самасвядомасці, дзе азначэнне «нацыянальная» надае ёй спецыфічнае адценне. Тут мы сутыкаемся са здольнасцю індывіда да рэфлексіі, да ідэнтыфікацыі сябе з пэўнай сацыяльнай групай, супольнасцю, адначасова дыстанцуючыся ад іншых аб'яднанняў. Гэта асабістыя думкі, разуменне, каштоўнаснае стаўленне да ўласнага этнічнага самавызначэння. Выяўляецца этнічная самасвядомасць чалавека як і іншыя формы самасвядомасці – у абазначэнні сябе этнонімам, у паводзінах і ўчынках, у сімпатыях і антыпатыях, у меркаваннях, у духоўнай творчасці. Да кампанентаў этнічнай (нацыянальнай) самасвядомасці адносяцца ўсведамленне падабенства з другімі членамі дадзенай нацыі і адрозненне ад другіх, разуменне ўзаемнай залежнасці і агульнасці гістарычнага мінулага, традыцый, культуры свайго народа, цікавасць і павага да гісторыі сваей краіны, да развіцця нацыянальнай мовы, грамадзянскай думкі, абароны нацыянальных інтарэсаў. Большасць аўтараў разглядаюць гэты від самасвядомасці як суб'ектыўнае адлюстраванне аб'ектыўна наяўных фактаў нацыянальнага жыцця і адносіны да іх. Навукоўцы ў гэтым агульнапрызнаным азначэнні падкрэсліваюць і некаторыя дадатковыя рысы. Так, напрыклад, М.С. Джунусаў, К.Н. Хабібуллін асаблівую ўвагу надаюць яе духоўнаму боку. Б.А. Шувалаў падкрэслівае яе ідэалагічны аспект. Прыярытэт псіхалагічнага аспекту падкрэслівае Г.О. Зіманас.

У апошнія гады праблема фарміравання этнічнай самасвядомасці атрымала павышаную цікаўнасць у педагогаў, аб чым сведчыць колькасць дысертацый, абароненых за дзесяць гадоў. Гэта работы Р.Ш. Малікава (1995), К.Н. Менлібаева (1995), Н.М. Мухтаравай (1995), А.Л. Барчук (1997), Л.М. Варанецкай (1997), Н.У. Строкавай (1999), Г.С. Сцяпанавай (1999), Л.Г. Зайцавай (2000), С.А. Харытонавай (2003), Л.К. Зязевай (2004), Л.П. Прокашэнкавай (2004), Д.В. Яфімавай (2005). У гэтых работах разглядаюцца пытанні фарміравання этнічнай (нацыянальнай) самасвядомасці як комплекснай сацыяльна-педагагічнай праблемы, асаблівасці фарміравання этнічнай самасвядомасці ў розных адукацыйных установах у іх узаемазалежнасці і ўзаемасувязі, узроставыя асаблівасці яе фарміравання, выкарыстанне розных сродкаў: нацыянальнай літаратуры, народных традыцый, фальклору і іншае.

Агульныя вынікі шматгадовых даследаванняў этнічнай самасвядомасці ў розных галінах навукі сфармуляваны В.Ю. Хацінец [4, с. 17–19]. Яна падкрэслівае, што:

– этнічная самасвядомасць з'яўляецца інтэгральным утварэннем, складовыя кампаненты якога знаходзяцца ў заканамернай сувязі і ўзаемаадносінах адзін з адным, прадстаўляючы сабой розныя ўзроўні станаўлення, першы з якіх выражае ўяўленні аб этнакультурнай рэальнасці, другі – этнічную ідэнтычнасць;

– у працэсе генезісу этнічнай самасвядомасці змяняецца яе структура, якая адрозніваецца большай прадстаўленасцю і інтэнсіўнасцю ўзаемасувязей паміж кампанентамі, а значыць – высокай выяўленасцю ўзроўняў яго станаўлення, цэласнасцю утварэння;

– асноўнымі псіхалагічнымі механізмамі праяўлення і развіцця этнічнай самасвядомасці з'яўляюцца этнафункцыянальныя працэсы ідэнтычнасці, г.зн.球 рознага роду самаідэнтыфікацыі, якія фарміруюцца на базе спецыфічнага стаўлення этнічных суб'ектаў да ўнікальных асаблівасцей этнакультурнага свету, на аснове якіх утвараюцца розныя формы выяўлення этнічнай самасвядомасці;

– этнічная самасвядомасць і этнічная індывідуальнасць уяўляюць сабою ўзаемапранікальныя і ўзаемазалежныя сістэмныя інтэгральныя утварэнні;

– этнічная індывідуальнасць ёсць цэласная характарыстыка індывідуальных уласцівасцей чалавека, арганізаваная ў інтэгральнае цэлае пасродкам знешняй дэтэрмінацыі этнічнага свету і пасродкам унутранай дэтэрмінацыі, у выніку чаго ўтвараецца спецыфічны характар узаемасувязей паміж індывідуальнымі ўласцівасцямі розных іерархічных узроўняў, якія ўключаюць у сябе падсістэму этнапсіхалагічных індывідуальных уласцівасцей на вышэйшых узроўнях яе структуры, характарызуюць індывіда ў аспектах этнічных адносін і ўзаемадзеянні;

– развіццё этнічнай індывідуальнасці ўзгоднена з базавымі працэсамі этнакультурнага развіцця чалавека.

Такім чынам, канстатуючы наяўнасць велізарнага масіву ўяўленняў аб этнічнай самасвядомасці і актыўную распрацоўку метадалогіі этнапсіхалагічных даследаванняў, якая яшчэ канчаткова не сфарміравалася, магчыма вызначыць, што этнічная самасвядомасць асобы надзвычай складаная з'ява, якая адлюстроўвае асабістыя думкі, разуменне, каштоўнасныя адносіны да ўласнага этнічнага самавызначэння. Яна з'яўляецца прадуктам складанага ўзаемадзеяння матэрыяльных і ідэалагічных зносін: уласнага вопыту асобы, каштоўнасных арыентацый, ідэалагічных і палітычных традыцый, зафіксаваных у нацыянальнай (этнічнай) культуры, сістэмы сацыяльных інстытутаў. Мае складаную структуру, шмат элементаў, якія ўвесь час узаемадзейнічаюць і рэкамбініруюцца і тым самым характарызуюць яе як дынамічную сістэму, цяжкую ў апісанні.

Прыведзеныя матэрыялы будуць карыснымі для кіраўнікоў сацыяльна-культурных устаноў усіх тыпаў, устаноў адукацыі пры вырашэнні пытання ўдасканалення працэсу ідэалагічнага і патрыятычнага выхавання падрастаючага пакалення з выкарыстаннем нацыянальна-культурнай, фальклорнай спадчыны.

## ЛІТАРАТУРА


1. ***Альшевская, Л.А.*** Формирование национального самосознания старшеклассников в учебно-воспитательной работе школы: дис. ... канд. пед. наук: 13.00.01 / Л.А. Альшевская. – Минск, 1993. – 185 л.
2. ***Грымаць, А.А.*** Фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці будучых педагогаў / А.А. Грымаць, Н.К. Катовіч. – Мінск: НІА, 1996. – 154 с.
3. ***Михневич, О.А.*** Теоретико-педагогические основы формирования национального самосознания будущих учителей / О.А. Михневич. – Минск: ТетраСистемс, 1996. – 261 с.
4. ***Хотинец, В.Ю*** Этничность в интегральном исследовании индивидуальности человека: методология, теория, эмпирика и педагогическая практика. На материале исследования коренных народов Западного Урала: дис. д-ра психол. наук: 19.00.01 / В.Ю. Хотинец. – М., 2003. – 415 л.
5. ***Гарнцев, М.А.*** Проблема самосознания в западноевропейской философии: (От Аристотеля до Декарта) / М.А. Гарнцев. – М.: Изд-во МГУ, 1987. – 214 с.
6. ***Чеснокова, И.И.*** Проблема самосознания в психологии / И.И. Чеснокова. – М.: Наука, 1977. – 144 с.
7. ***Бромлей, Ю.В.*** Очерки теории этноса / Ю.В. Бромлей. – М.: Наука, 1983. – 412 с.
8. ***Хабибуллин, К.Н.*** Испытания национального самосознания / К.Н. Хабибуллин, Н.Г. Скворцов. – СПб.: Петрополис, 1993. – 120 с.
9. ***Хьелл, Л.*** Теории личности: (основные положения, исследования и применение) / Л. Хьелл, Д. Зиглер. – СПб.: Питер Пресс, 1997. – 608 с.
10. ***Шорохова, Е.В.*** Проблема «Я» и самосознание // Проблемы сознания: материалы симпозиума / Ин-т философии, Акад. наук СССР; под ред. В.М. Банщикова. – М., 1966. – С. 217–227.
11. ***Рубинштейн С.Л.*** Основы общей психологии: в 2 т. / С.Л. Рубинштейн. – М.: Педагогика, 1989. – Т.1. – С. 17.

12. ***Лурия, А.Р.*** Об историческом развитии познавательных процессов. Эксперим.-психол. исследование / А.Р. Лурия. – М. : Наука, 1974. – С. 162.
13. ***Durkheim, E.*** The Elementary Forms of Relegious Life / E. Durkheim. – N. Y., London, 1965. – 198 p.
14. ***Тишков, В.А.*** О феномене этничности / В.А. Тишков // Этнографическое обозрение. – 1997. – № 3. – С. 6.
15. ***Солдатова, Г.У.*** Психология межэтнической напряженности / Г.У. Солдатова. – М.: Смысл, 1998. – С. 42.
16. ***Эриксон, Э.*** Идентичность: юность и кризис / Э. Эриксон; пер. с англ.; общая ред. и предисл. А.В. Толстых. – М.: Прогресс, 1996. – 342 с.
17. ***Филиппова, Е.И.*** Камо грядеши? / Е.И. Филиппова, В.Р. Филиппов // Этногр. обозрение. – 1992. – № 6. – С. 7–8.
18. ***Винер, Б.Е.*** Этничность в поисках парадигмы изучения / Б.Е. Винер // Этнограф. обозрение. – 1998. – № 4. – С. 11–12.
19. ***Джарылгасинова, Р.Ш.*** Теория этнического самосознания в советской этнографической науке: (основные аспекты проблемы) / Р.Ш. Джарылгасинова // Совет. этнография. – 1987. – № 4. – С.9-22.
20. ***Казакова, І.В.*** Народная творчасць у фарміраванні этнасу беларусаў / І.В. Казакова // Весці Акад. навук Беларусі. Сер. гуманітар. навук. – 1995. – № 1. – С. 71–76

S U M M A R Y

*The article presents an overview of the national identity theoretical foundations in domestic and foreign literature. Multiple ways of perception of the national identity concept are assembled into interconnected trends. It allows to creat a more vivid depiction of peculiarities of stages, forms, and methods of research, and makes them stand out among various disputes and approaches customary to a wide range of scientific schools, when forming national identity. The article will be a great help not only to research scientist but also to teachers in finding the answers to the tasks of ethnic-cultural upbringing.*

*Поступила в редакцию 30.05.2007*